Спорт-тайм

# ПЕРАЖЫЦЬ ГЭТУЮ ГУЛЬНЮ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра паражэнне зборнай Беларусі ў адборачным турніры чэмпіянату свету 2018 года, пра старт БГК імя Мяшкова ў 1/8 Лігі чэмпіёнаў і барацьбу беларускіх хакеістаў у фінальнай серыі экстралігі.**

***1. Футбалісты зборнай Беларусі атрымалі трэцяе паражэнне ў адборачным турніры чэмпіянату свету 2018 года, саступіўшы ў гасцях шведам 0:4.*** Нагадаем, заключны матч першага круга ў групе А яны правялі пад кіраўніцтвам **новага галоўнага трэнера Ігара КРЫВУШЭНКІ.**



*— Цяжка каментаваць матч, дзе дапускалі дзіцячыя памылкі, пасля якіх супернік забіваў. Што рабіць, трэба пераджыць гэтую гульню. Разбяром яе ўнутры каманды. Такія памылкі гульцам дапускаць нельга. Нават ляпы, я сказаў бы. Не хапіла здаровай спартыўнай агрэсіі, ціску на створ варот саперніка. Шведы перасягнулі нас у гэтым кампаненце. Лік адлюстроўвае гэта ў поўнай меры. Складана сказаць, у чым прычына такіх памылак, бо яны дапускаліся ў простых сітуацыях. Магчыма, справа ў страце канцэнтрацыі. У поўнай меры падзяляю адказнасць за вынік з футбалістамі. Наваt, напэўна, у большай. Што заслужылі — выслухаем, —* адзначыў Ігар Крывушэнка.

Лідар групы зборная Францыі ў 5-м туры перамагла на выездзе аўтсайдараў турніру футбалістаў Люксембурга — 3:1, у Сафіі каманда Балгарыі нечакана абыграла галандцаў — 2:0. Наступныя сустрэчы адборачнага турніру адбудуцца 9 чэрвеня. Зборная Беларусі згуляе на полі «Барысаў-Арэны» з футбалістамі Балгарыі.

***2. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова на дамашняй пляцоўцы ў 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў мінімальна саступіў нямецкаму «Фленсбургу» — 25:26.***

*— Гульня была складанай. Ведалі, які сапернік нам супрацьстаіць. Першыя 15 хвілін правялі вельмі добра. Затым пайшлі страты, варатар немцаў пачаў добра ратаваць сваю каманду, атрымалі тры-чатыры лёгкія галы. У гэты момант праваліліся псіхалагічна. У канцоўцы трохі змянілі абарону і пераламалі ход гульні ў заключныя 10 хвілін. Фізічна на сыходзе матча, лічу, выглядалі лепей — заслугоўвалі нічыёй. Цяпер трэба ехаць у Германію і пастарацца паказаць добры вынік, —* адзначыў **галоўны трэнер брастаўчан Сяргей БЯБЕШКА.**

***3. Хакеісты «Нёмана» ў Мінску двойчы перамаглі «Юнацтва» ў фінальнай серыі экстралігі.*** Першая сустрэча завяршылася з лікам 2:0 на карысць гасцей, другая — 5:3.

*— Перамог той, хто хацеў, што яшчэ сказаць. Надзея памірае апошняй, але, каб на нешта спадзявацца, трэба трэніравацца. Увогуле ў нас сёння гуляюць ад сілы тры-чатыры хакеісты, астатнім проста пашанцавала аказацца ў «Юнацтве», —* адзначыў **галоўны трэнер сталічных хакеістаў Міхаіл ЗАХАРАЎ.**

Фінальная серыя да чатырох перамог працягнецца ў Гродне 29 і 30 сакавіка.

***4. Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» прайгралі 16-ы матч у Адзінай лізе ВТБ, саступіўшы на сваёй пляцоўцы краснаярскаму «Енісею» — 78:86.*** Такім чынам, сталічным баскетбалістам засталося правесці чатыры паядынкі «банкаўскага» турніру: дома з пермскай «Пармай» (2 красавіка) і «Ніжнім Ноўгарадам» (16 красавіка) і ў гасцях у лідара Адзінай лігі ВТБ маскоўскага ЦСКА (10 красавіка) і краснадарскага клуба «Лакаматыў-Кубань» (23 красавіка). Цяпер у актыве мінчан чатыры перамогі ў 20 праведзеных паядынках і 12-е месца сярод 13 удзельнікаў турніру.

***5. Ірына Прасянцова і Кірыл Касьянік перамаглі ў змешанай эстафеце на другім этапе Кубка свету ў Каіры па сучасным пяцібор'і.***

Па выніках першага віду праграмы — фехтавання — Ірына Прасянцова і Кірыл Касьянік набралі 247 балаў і ўпэўнена займалі першае месца. Паспяхова склалася для беларусаў плаванне і канкур, што дазволіла ім выйсці першымі на старт у камбінаваным відзе (стральба і крос).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.52 | 19.38 | 12.46 |
| Віцебск — | 6.41 | 19.29 | 12.48 |
| Магілёў — | 6.42 | 19.28 | 12.46 |
| Гомель — | 6.40 | 19.24 | 12.44 |
| Гродна — | 7.08 | 19.53 | 12.45 |
| Брэст — | 7.09 | 19.53 | 12.44 |

**Месяц**

***Маладзік.***
***Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Агапія, Аляксея, Аляксандра, Дзмітрыя, Дзяніса, Міхаіла.*
***К.*** *Анелі, Яны, Аляксандра, Антона, Яна.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**28 САКАВІКА**

**1868** год — нарадзіўся Максім Горкі, рускі пісьменнік і грамадскі дзеяч, ганаровы акадэмік НАН Беларусі (1932). Заснавальнік шэрагу часопісаў, кніжных серый. Аўтар раманаў «Фама Гардзееў», «Трое», «Маці», п'ес «На дне», «Дачнікі» і інш. Адзін з першых падтрымаў беларускую літаратуру, даў высокую ацэнку творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Пераклаў на рускую мову верш Я. Купалы «А хто там ідзе?». Цікавіўся беларускім фальклорам. Быў падпісантам і актыўным чытачом газеты «Наша ніва». З 1896 года быў у сяброўскіх адносінах з сям'ёй А.Я. Багдановіча. Некалькі разоў прыязджаў у Мінск, сустракаўся з Я. Купалам, Ц. Гартным, А. Александровічам, К. Крапівой, П. Галавачом. З пачатку 1920-х гадоў на сцэнах мінскіх і абласных тэатраў ставілася яго п'есы «На дне», «Апошнія», «Зыкавы», «Мяшчане» і інш. У Беларусі неадназова выдаваліся і перакладаліся яго творы. Памёр у 1936 годзе.

**1902** год — 115 гадоў таму нарадзіўся Сцяпан Прохаравіч Маргелаў, беларускі вучоны ў галіне геаграфіі, кандыдат эканамічных навук, прафесар (1930). Аўтар навуковых прац па размяшчэнні прамысловасці, сельскай гаспадаркі, па народанасельніцтве Беларусі. Удзельнічаў у складанні плана 2-й пяцігодкі, у рэдагаванні Вялікага Савецкага атласа, у эканамічным абследаванні раёнаў Беларусі. У 1937 годзе рэпрэсаваны. Памёр у 1938-м. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

**1912** год — нарадзілася Марына Міхайлаўна Раскова, першая савецкая жанчына — лётчыца-штурман, маёр, удзельніца знакамітых беспасадачных пералётаў (з В. Грызадубавай і П. Асіпенкай), Герой Савецкага Саюза . У гады Вялікай Айчыннай вайны камандавала авіягрупай па фарміраванні жаночых авіяпалкоў; у самы кароткі тэрмін падрыхтавала першы ў гісторыі жаночы авіяцыйны бамбардзіровачны полк, які пазней быў узнагароджаны за баявыя заслугі ордэнамі Чырвонага Сцяга і Суворава і ўдастоены ганаровага наймення «Таманскі». Загінула ў 1943 годзе пры выкананні службовых абавязкаў за штурвалам самалёта.

**1942** год — 75 гадоў таму адбыўся бой партызанскіх атрадаў Д.Ф. Райцава і А.П. Дзіка супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у раёне вёсак Курына, Платы і рабочага пасёлка Ноўка Суражскага раёна, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Курынскі бой. Партызаны М. Сільніцкі і М. Купчанка 27 сакавіка разграмілі групу гітлераўцаў, якія рабавалі насельніцтва ў вёсцы Вусава. На наступны дзень супраць партызан выступіў карны атрад немцаў (каля 350 чалавек). Партызаны ўстроілі засады ў вёсках Курына і Платы. У выніку 8-гадзіннага бою было знішчана 115 карнікаў і паранена 169, аднак да гітлераўцаў падышло вялікае падмацаванне, і партызаны мусілі адступіць. Міхаілу Сільніцкаму, які загінуў у баі і які асабіста знішчыў каля 50 гітлераўцаў, пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



Было сказана

**Альберт ЭЙНШТЭЙН, фізік-тэарэтык:**
*«Свабода чалавека ў сучасным свеце падобная на свабоду чалавека, які разгадвае крыжаванку: тэарэтычна, ён можа ўпісаць любое слова, але на самай справе ён павінен упісаць толькі адно, каб крыжаванка склалася».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Аднойчы мой дзядзька зімой выбег з саўны, крыкнуў «Хлопцы, я ў дровы!» і скокнуў у гурбу. Гэта былі дровы, прыкрытыя снегам. З тых часоў у яго мянушка Настрадамус.**

— Доктар, а ад чаго гэтыя лекі за $1000?
— Гэта ад лішніх грошай!

**Калі нейкая жанчына спытала, ці згодны я ўзяць у жонкі нейкую Зінаіду...**

**...Я імгненна зрабіўся цвярозым.**

На курорце.
— Мама, можна мне пакупацца ў моры?
— Ні ў якім разе — глядзі, якія хвалі!
— Але тата ж купаецца!
— Яму можна — ён застрахаваны.

**Я заўсёды вяду здаровы лад жыцця. Нават п'ю «За здароўе!»**



Малюнак Сяргея ВОЛКАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1130.
Нумар падпісаны ў 19.30 27 сакавіка 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12